# ПРЫСЛОЎЕ

**Асноўныя паняцці:** прыслоўе, нязменнасць як асноўная марфалагічная рыса прыслоўяў, прыслоўі вытворныя (матываваныя) і невытворныя (нематываваныя), знамянальныя і займеннікавыя, разрады прыслоўяў паводле значэння (азначальныя і акалічнасныя), ступені параўнання якасных прыслоўяў; спосабы ўтварэння.

**1. Выпішыце з тэксту прыслоўі. Вызначце іх разрад па значэнні і словаўтваральнай структуры. Адзначце сінтаксічную ролю прыслоўяў у сказе.**

Восенню, зімой і ранняй вясною ў хваёвых барах , у ельніках, у старых алешніках, у дубровах мы часта бачым адзінокіх стракатых дзятлаў, якія з ранку да вечара выстукваюць, выслухоўваюць дрэвы. Кожны дзяцел сам аглядае свой участак, гаспадарыць на ім.

Штодня яны сядзяць на дрэвах: ні мароз, ні мяцеліца, ні дождж не перашкаджаюць ім здабываць нялёгкаю працаю свой хлеб. І ўсе мы даўным-даўно звykліся з думкаю, што яны кормяцца толькі тым, што дзяўбуць сукі і сухадрэвіны, дастаючы з-пад кары і з драўніны караедаў, шашаляў. Затулімся, затаімся за густым кустом арэшніку і паназіраем за дзятлавым дуплом. З дупла даносяцца звонкія галасы дзятлікаў. Яны крычаць наперабой, крычаць бадзёра і заўзята, патрабуючы есці.

Як толькі я асцярожна наблізіўся на дзесятак метраў да асіны, адразу ж прыляцелі старыя дзятлы і так раскрычаліся, што хоць вушы затыкай. На гэтыя трывожныя крыкі зляцелася шмат іншых птушак. Усім хацелася паглядзець, што тут робіцца. Але, убачыўшы мяне за кустом арэшніку, які рос метры за два ад асіны, яны паступова разляцеліся. Засталіся толькі старыя дзятлы, якія не маглі змірыцца, што я стаю побач. Потым супакоіліся і паляцелі шукаць дзеткам корм.

З. Бяспалы.

**2. Выпішыце словазлучэнні з прыслоўямі. Вызначце, да якой часціны мовы прымыкаюць у сказе прыслоўі і што яны абазначаюць (прымету дзеяння, прымету прыметы ці прымету прадмета).**

1. Рука была шырокая, моцная, па-сялянску шурпатая (З.П.). 2. Да нас падышоў змрочны дзядзька з барадкай клінам, з касымі вачамі, у якіх жыла, здавалася, уся журба свету (Каратк.). 3. Восень хілілася ўжо на зыход, пакрапвалі дажджы, на зямлі слаліся аблокі туману, але халады яшчэ не наступалі, было адносна цёпла (У.Г.). 4. Ёсць сонца, лес і рэчка, што цячэ, як і жыццё тваё, не вельмі прама (С.З.). 5. Пасярэдзіне кузні стаяў разгарачаны Цішка. Збіраўся дастаць з агню дачырвана разагрэты жалезны акравак (У.Г.). 6. Іржалі напалоханыя коні, крычалі раз'юшаныя паліцыянты, шчодра паласуючы людскія спіны бізунамі (У.Г.). 7. Між дрэў асабліва кідалася ў вочы падарожнага старадрэвіна-хвоя, што стаяла зусім адна на высокім грудзе (К-с). 8. Мелодыя спеваў жаўранка надзвычайна багатая, разнастайная, дзівосна прыгожая і такая чоткая, такая выразная, што яе можна палажыць на ноты... (К-с). 9. І шчаслівы я буду, шчаслівы папраўдзе, калі ў гуле мільёнаў рабочых прылад, што ствараюць-куюць шчасце міру і працы, і мая прагучыць сугалосна і ў лад (Гіл.). 10. Пашчасціла Веры і з мужам: добры, спакойны і зусім не лайдак (Каратк.). 11. Пагоркі падступалі да ракі, то паката спускаючыся зялёнымі адхонамі, то нізка навісаючы над ёй стромымі кручамі (Хадк.). 12. Калі прыйшла мая чарга [спяваць], я прысеў на нядаўна вызваленае месца на першым сядзенні, побач з сімпатычнай пажылой масквічкай (Б.). 13. Паяўленне Ірыны госці сустрэлі шумна, перабольшана радасна (З.П.).

**3. Выпішыце прыслоўі, групуючы іх паводле значэння: азначальныя (якасныя, колькасныя, спосабу дзеяння, параўнання, сумеснасці) і акалічнасныя (месца, часу, прычыны, мэты).**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1. Ледзь чутна дыхнуў вецярок, пяшчотна зашапацелі прыдарожныя бярозы (У.Г.). 2. Пена клочччам валілася з конскіх мордаў (У.Г.). 3. Дзе няма ведаў, там не будзе смеласці (Прык.). 4. Матчыны рукі заўсёды мяккія (Прык.). 5. Калі мужчыны, шумна бразгаючы дзвярамі, гуртам вываліліся на вуліцу, мяцеліца збольшага ўжо аціхла, мітусіліся толькі рэдкія сняжынкі, з-за хмар белай плямкай выглядала сціплае зімовае сонца (У.Г.). 6. І дзень не затаіўся, а ўсміхнуўся і промнем казытнуў мяне крадком, нібыта да шчакі ён дакрануўся адбеленым матуляй ручніком (С.З.). 7. Лесніка ад нечаканай сустрэчы з мядзведзем нібы паралізавала. На мядзведзя таксама нешта найшло (Бясп.). 8. Косця чамусьці падумаў, што, урэшце, кожны чалавек не свабодны і не заўсёды дзейнічае па патрэбах душы, а часцей згодна той ролі, якую ён прыняў пад уладай абставін, якія нейкім чынам склаліся (У.Г.). 9. У лесе Косцік вывернуў на другі бок кажух, надзеў на сябе і пайшоў назіркам кустамі (С.А.). 10. Жнуць удваіх, маці з сынам (І.М.). 11. Цудоўная ноч!... Ніяк не прыдумаць такую сумысна! (У.Д.). 12. Нашто было лезці ў чужы агарод? (К-с).

**4. Выпішыце прыслоўі, якія маюць формы ступеней параўнання. Вызначце гэтыя формы і спосабы іх утварэння.**

1. Не саромейся пытаць – болей спытаеш, больш пазнаеш (Прык.). 2. Бачыць вока далёка, а розум яшчэ далей (Прык.). 3. ...Сотнікаў усё марудней перастаўляў ногі, часта спыняўся і ўсё кашляў (В.Б.). 4. Сотнікаў адчуваў, як проста было ператварыцца з напарніка ў абузу, і найбольш асцерагаўся менавіта таго, хоць і ведаў, што, калі здарыцца найгоршае – выйсце для сябе ён знойдзе сам, не абцяжарыць нікога (В.Б.). 5. Праўдаю найдалей дойдзеш (Прык.). 6. Найбольш прывабна выглядала ў гэты сумны дзень маленькая хвойка (К-с). 7. Вышэй ад сваіх пят не падскочыш (Прык.). 8. Пасля такіх непрыемнасцей Андрэй зразумеў, што да заняткаў трэба ставіцца больш адказна, з душой (К-с). 9. Ён [старшына] не хацеў болей размаўляць з гэтым байцом, які дужа хутка здагадаўся аб усім, чаго лепей было б не ведаць яму, і пайшоў прэч (В.Б.). 10. Калі ёсць многа, дык хочацца яшчэ больш. А калі няма нічога, дык якая драбніца – мара (В.Б.). 11. А мая нянавісць толькі хоча, каб ярчэй палала сонца праўды, каб, адзіная на цэлым свеце, ты, любоў, заўсёды панавала (Гіл.). 12. Крыху далей ад цагельні пачыналася поле (І.М.).

**5. Выпішыце са сказаў прыслоўі, якім уласцівы формы суб’ектыўнай ацэнкі. Утварыце і запішыце гэтыя формы. Абазначце формаўтваральныя марфемы і растлумачце, якое значэнне яны надаюць прыслоўю.**

1. Сядзіць ціха, а думае ліха (Прык.). 2. Так бывае: стары бор хораша спалучаецца з маладым падлескам (С.П.). 3 Багушэвіч здолеў прымусіць па-новаму загучаць беларускую мову – натуральна, гнутка, афарыстычна і прыгожа (Стр.). 4. Маці патроху ачуняла ад гора, супакоілася і калі-небудзь, паклаўшы спаць Настачку, садзілася да сына і казала: “Нічога, не бядуй, сынок, як-небудзь пражывём” (В.Б.). 5. Не той многа ведае, хто доўга жыў, а той, хто многа вучыўся (Прык.). 6. Лепш крыху зрабіць, чым багата пагаварыць (Прык.). 7. Новы венік чыста мяце (Прык.). 8. Светла ў сне ўсміхаецца дачка, цёплая, як ліпеньская ночка (С.З.). 9. Восень падкрадваецца заўсёды ціха, як котка (Я.С.). 10. На гэты раз, пакуль ёсць колькі вольных хвілін, запісваю ўражанні пражытага дня раніцай (З.П.). 11. Ноччу падмарозіла, а пад раніцу пайшоў і снег (Каратк.). 12 Слаўся [туман] вузкімі сінімі палосамі, адна на адну, высока над зямлёй, уdroўень з платамі (Пташ.).

**6. Выпішыце са сказаў прыслоўі, якія ўтвораны ад назоўнікаў. Выканайце марфемны разбор гэтых прыслоўяў.**

1. Апаўдні шчаслівы, пачарнелы, потны сенакос з абрыву бухне ў вір дрымотны (Вял.). 2. Плыць бы нам, маракам, плыць праз ночы і дні, каб давеку матроскай не чуць цішыні (Зар.). 3. Як пойдзеш нацянькі, дык праходзіш тры дзянькі (Прык.). 4. Кожны вечар Міша чытаў яе [Біблію] – уголас, каб чула ўся сям’я і тыя, хто прыходзіў (У.Г.). 5.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Падзівіўся ляснік на мядзведзеву работу і пайшоў дадому (Бясп.). 6. Сплывалі крыгі ўніз па Нёмане, нібы купальскія вянкі (С.З.). 7. Увосень плача, хто ўвесну скача (Прык.). 8. І талака, нібы мурашнік, вянцы параскідала ўміг (С.З.). 9 Вечарам хлопцы павялі мяне ў клуб. На танцы. Да гэтага я ўпарта адмаўляўся (З.П.). 10 Панаставілі замкаў, а жыць не жывуць... – міжволі падумалася Ірыне. – Ці не ў такі вось замак вязуць зараз і мяне?” (З.П.). 11. У прыгаршчу Косціч набраў халоднай вады, крыху прапусціў праз худыя доўгія пальцы і ахаладзіў разгарачаны твар (Гаўр.). 12. Часамі над прасторамі зялёнага мора, як вартаўнікі, узнімаліся пышныя постаці адзінокіх дрэў, пераважна дубоў, параскіданых дзе-нідзе сярод лугу (К-с).

**7. Утварыце ад наступных назоўнікаў як мага больш прыслоўяў і запішыце іх. Вызначце спосаб утварэння.**

Ніз, верх, бок, восень, зіма, дом, ранак, ноч, гара, дзень, рэшта, даль, раз, праўда, вечар, раніца.

**8. Выпішыце са сказаў прыслоўі, якія ўтвораны ад прыметнікаў. Выканайце марфемны разбор гэтых прыслоўяў.**

1. Аляксей запыленыя боты збольшага паабіваў аб цвёрды рамоннік пад плотам і пайшоў у райана (Грах.). 2. Ахрэм люта біў малатком, аднак кавалак хутка астыў, і Цішка зноў сунуў яго ў жар (У.Г.). 3. Месяцы зліваліся ў гады, сын падрастаў, і Мерыям паціху стала задыхацца ад адзіноты і бяздзейнасці (Гаўр.). 4. Хойслер па-дзіцячы непасрэдна скакала ад задавальнення, смакуючы блінцы з разынкамі. Назва стравы гучала па-беларуску “налістнікі”, і яна вывучыла з беларускай мовы гэтае слова першым (Гаўр.). 5. Злева, на ўзгорку, паміж сядзібаю Пацаў і выносным меднаствольным сасоннікам рос тоўсты дуб (У.Г.). 6. Мікіта ўвішна і шустра прабег па гандлёвых радах, пацікавіўся цаной на яблыкі (У.Г.). 7. За ўдарам удар, дуб за дубам ляціць на раллю. Для жыцця, для любві сонца зноў адмыкае зямлю (А.К.). 8. Юрась змалку лічыўся балбатуном (Атр.). 9. Бергнер здзівіўся: -- Будзем гаварыць начыстую? (І.Г.). 10. Вучыся змоладу, на старасць як знойдзеш (Прык.). 11. У маладосці не давялося абзавесціся сям’ёй, а пад старасць і пагатоў (Кул.). 12. Сава, доўга не думаючы, звярнуў налева і, як птушка, знік на шляху (Пестр.). 13. Направа ад дарогі рос авёс, налева – памідоры спелі (Корб.).

**9. Утварыце ад наступных прыметнікаў як мага больш прыслоўяў і запішыце іх. Вызначце спосаб утварэння.**

Адкрыты, новы, салдацкі, дзявочы, халасты, сляпы, сухі, левы, жывы, роўны, гатовы, ціхі, рэдкі, рассыпны, мядзведжы, бацькоўскі.

**10. Вызначце, ад якой часціны мовы і якім спосабам утвораны выдзеленыя прыслоўі.**

1. На зіму для Васі справілі кажушок, які **няблага** бараніў ад холаду, бо падступалі ўжо калядныя маразы (У.Г.). 2. Да Трахіма Лявон ставіўся насцярожана – ведаў яго нораў: яму калі руку падаеш – **перш** пальцы палічы, бо адхопіць (У.Г.). 3. **Так**, як прагне дажджу жытні колас у спёку і шукае святла той, хто ў цемрадзі слеп, -- **так** цягнуліся людзі да праўды высокай, што патрэбна была, як паветра, як хлеб (С.З.). 4. Абы-які **двойчы** робіць, а скупы **тройчы** траціць (Прык.). 5. Брат быў **зусім** не такога, як ён [Фішар], характару (В.Б.). 6. Здарылася тое **залетась**, позняю восенню, калі раён апынуўся ў прарыве па льназдачы (В.Б.). 7. Серадзібор, прабіўшыся веерам некалькіх вуліц у лясныя гушчары, спіць у світальнай сіняй цішыні, спакойны, **па-свойму** прыгожы (Пестр.). 8. Ён [Ігар] раптам адчуў, што **ўпершыню** менавіта гэтым надвячоркам на зямлю лягло незвычайна мяккае цяпло (Гаўр). 9. Яблыкі цёрліся адно аб другое і прарэзліва пішчалі, нібы скардзячыся гаспадару, што іх такім чынам, груба, страсаюць і **кудысьці** нясуць (У.Г.). 10. Дзванарык усё ж такі пачуў шум і, абгарнуўшыся ў халат, выбег з хаты, але **навокал**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ужо зноў запанавала цішыня (У.Г.). 11. **Загадзя** і скрупулёзна распрацоўваючы шматлікія аспекты вайны супраць Савецкага Саюза, Гітлер разам з лёсам усяго беларускага народа ўлічыў і Хатынь (В.Б.). 12. Міхал, агледзеўшы свае палеткі, **нехаця** паплёўся ў бок лесу (К.Ч.). 13. У балоце **кішма** кішаць п'яўкі, гадзюкі (Гр.).

**11. Утварыце прыслоўі ад наступных слоў, выкарыстоўваючы розныя афіксы. Вызначце спосаб утварэння. Складзіце сказы з прыслоўямі, утворанымі ад займеннікаў.**

Добра, мой, як, адкуль, калі, дзе, другі, пяцёра, трое, двое, іхні, усе, што, чаму, той, адкуль, высока, чуць, чаго.

**12. Спішыце сказы, раскрываючы дужкі. Растлумачце, як утвораны складаныя прыслоўі.**

1. Там (сям) узвышаліся на фоне неба прыдарожныя бярозы, таполі, пасохлыя бязлістыя вербы, цямнелі на ўзгорках кусты ядлоўцу (У.Г.). 2. На прагулку выйшаў сом, ён раз (пораз) усплёскваў ваду, парушаючы вячэрнюю цішыню (І.Г.). 3. Па рэспубліцы восень ідзе. Кажуць, рысы старыя захоўвае. Гэтак (сама) стаіць на вадзе пачарнелае лісце альховае (Гіл.). 4. Дзе (нідзе) сярод палешукоў траплялiся палякі і яўрэі (І.М.). 5. Тамаш Зан быў галоўным арганізатарам радыкальных згуртаванняў моладзі ў Мінску. Як (раз) ён з Адамам Міцкевічам і Юзафам Яжоўскім быў ініцыятарам стварэння Таварыства філаматаў (Цвір.). 6. Ціха (ціха) пакалыхваў шара-празрыстымі, пухкімі, чубатымі макаўкамі дзьмухавец…(Ад.). 7. Вакол стаяла такая цішыня, што чутно было, як сям (там) ад сваёй жа кволасці зрываўся сухі ліст (Кул.). 8. Цяпер ужо стары сам узбіраецца сяды (тады) на тое ўзвышша, адкуль яго чакала калісьці Ганулья (Б.). 9. Калі (нікалі) кіне сярод балот свой голас бусел, ніколі не закрычыць ён у хоры (В.К.). 10. Нарэшце сын асцярожна адхіліў маці, узяў за руку і (на) (паў) голаса сказаў: "Хадзем у хату" (Чыгр.). 11. Учора ён [Арцём] толькі (толькі) вярнуўся з камандзіроўкі…, і за абедам жонка падала тэлеграму (Чыгр.). 12. Каб не разбудзіць астатніх, пачалі хлопцы гаворку (на) (паў) голаса, іншы раз нават пераходзячы на міміку (Каратк.). 13. (Што) дня дзятлы сядзяць на дрэвах: ні мароз, ні мяцеліца, ні дождж не перашкаджаюць ім здабываць нялёгкай працаю свой хлеб (Бясп.). 14. Вялікае шчасце – жыць, таптаць (баса) нож росныя травы, збіраць кветкі, радавацца сонцу, высокаму, чыстаму небу (З.П.).

**13. Спішыце сказы, раскрываючы дужкі. Растлумачце правапіс прыслоўяў.**

I. 1. Чалавек, адарваны ад Бацькаўшчыны, ад роднай зямлі, не можа быць (па) сапраўднаму шчаслівы, як бы добра яму на першы погляд ні жылося (Гіл.). 2. Шчадроўка, відаць, прыйшлася гаспадару (да) спадобы, і ён, не марудзячы, вынес кавалак сала і хлеб (У.Г.). 3. (На) пачатку Ігар засяроджваў увагу на ўсім, што бачыў, але (па) ціху ў думках аддаляўся ад горада і яго хараства (Гаўр.). 4. Хлопцы (на) вобмацак узялі з мяшка па яблыку. Васю дастаўся няспелы, ён адкусіў, праглынуў кіслы сок, а рэшту выплюнуў, кінуўшы (у) бок адкусаны яблык (У.Г.). 5. Грукочуць вазы, самаходы, (без, бес) перастанку снуюць вайскоўцы, чыноўны люд, паны (У.Г.). 6. (Па) крысе завязвалася гаворка (Скр.). 7. (З) ранку яшчэ гнала ў вочы сухі калючы град (Ад.). 8. Дождж растапіў снег, і цяпер на лёдзе стаяла падсіненая (з, с) (пад) (і, ы) спаду вада (Асіп.). 9. (Над) вечар інсургенты на лёгкіх фурманках і забраных на конскім заводзе рысаках вырушылі з горада (У.А.). 10. На рагу колішняй хаты (не) (у) прыцям вылезла з пустазелля калючая дзічка-груша (В.Б.). 11. Юнак, дзяўчына, якім пашчасціла (з) малку сустрэць настаўнікаў і выхавацеляў, чуйных да хараства слова, праз усё жыццё будуць дзякаваць ім за душэўнае святло, за чысціню пачуццяў, якія (як) раз і робяць чалавека шчаслівым (Віт.). 12. На магутным усохлым дрэве Лявон заўважыў гняздо з маладымі бусламі, якія раз (пораз) узмахвалі цёмнымі крыламі (У.Г.). 13. (У) вачавідкі цямнела, налівалася глыбокай сінню

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

паніжэлае неба (З.П.). 14. Стаялі яны густа, амаль (у) прытык адзін да аднаго і ад таго нагадвалі нейкае нерэальнае відовішча (З.П.).

II. 1. (Пад) вечар ляснік выйшаў на вялікую паляну сярод лесу і спыніўся: мінулай ноччу ў авёс наведаўся мядзведзь (Бясп.). 2. Чакаў кур'ера з грашыма і дакументамі, аднак той, як (на) зло, не з'яўляўся (У.Г.). 3. За выключэннем некаторых раёнаў Палесся, беларускую хату (ні) колі не беляць (з) (на) дворку, толькі (у) нутры (Каратк.). 4. Ён [Косціч] не злаваўся (на) паказ, але сапраўдная бура паднімалася ўнутры яго (Гаўр.). 5. (Да) рэшты, да крывога сучча, агаліліся кусты і дрэвы (У.Г.). 6. Міша (па) троху акампанаваў на цытры, кранаючы струны (ад) разу ўсёй далонню (У.Г.). 7. Патрыярхальна буркавалі галубы, (па) гаспадарску асвоіўшы чарапічныя дахі (Гаўр). 8. На момант старшыну чаму (сьці) стала шкада таго вучонага, разумнага чалавека, не прызвычаенага да нягод ваеннага жыцця, слабага і кволага (В.Б.). 9. Свіст (не) (у) заметку паклаў на спод кацялка выцягнутае ў Пшанічнага сала, ад чаго ўсё гэта несалёнае месіва атрымалася вельмі тлустае і наварыстае (В.Б.). 10. За свае дзесяць гадоў хлопчык такога матылька сустрэў (у) першыню і таму вельмі хацеў злавіць яго, хацеў несці яго ў руках, пагуляць з ім, пацешыцца, а потым паказаць маці (Дайн.). 11. Нерухомыя елкі ўткнулі ў неба свае доўгія пікі-верхавіны. (У) нізе пад іх шырокімі лапамі змрок (Дзел.). 12. …А там была ўжо (на) пагатове раскрытая дзюба дзятліка. Стары вельмі хутка паклаў у яе корм (Бясп.). 13. Бусел упарта абараняў свой прытулак, а вецер пагражаў, скуголіў, раз'юшана завываў, стараючыся (з, с) (пад) нізу падчапіць гняздо і скінуць яго разам з птушкай на зямлю (Пальч.). 14. (З, с) пачатку Ірына, калі чула сваю мянушку, крыўдзілася: знайшлі з кім параўноўваць – з нейкай каракаціцай (З.П.).

**14. Спішыце сказы. Прыназоўнікі з назоўнікамі пішыце асобна, а прыстаўкі з прыслоўямі – разам. Растлумачце правапіс спалучэнняў, блізкіх да прыслоўяў.**

1. Адубелыя рукі самі шукаюць цяпла (за) пазухай і ў кішэнях, са старожкі чуецца размова, нешта там апавядае балбатун Свіст (В.Б.). 2. Бусел (з, с) перапуду падскочыў на месцы, міжвольна распасцёр крылы, але тут жа зноў падняў іх, каб не ўзняцца з гнязда (Пальч.). 3. Потым, (пад) вечар, нас калаціў на калдобах аўтобус (Б.). 4. У сады прыходзіць той час, калі дрэвы, вызваліўшы галіны з-пад цяжару, шумяць (усё) роўна (не) вясёла, нібы сумуючы па яблыках, якія цяпер ляжаць на зямлі (Я.С.). 5. Багдановіч выявіў шмат фантазіі, каб падрыхтаваць (як) след вечарынку, аформіць запрашэнні, а пасля і наладзіць сустрэчу (Дал.). 6. У дубровах мы часта бачым адзінокіх стракатых дзятлаў, якія (з) ранку (да) вечара аглядаюць, выстукваюць, выслухоўваюць дрэвы (Бясп.). 7. Разгаварыліся мы (на) дзіва хутка і лёгка (З.П.). 8. Энергічны, жвавы, учэпістага, вёрткага розуму, ён ва ўсякай справе адчуваў сябе звыкла і ўсё разумеў (з) ходу (В.Б.). 9. Калі справа не (пад) сілу, дык на плечы не бяры (Прык.). 10 (На) досвітку атухне зор вуголле, як прысак, пашарэе Млечны Шлях…(С.З.). 11. Восень (з) роду такой не была: асыпаюць плады рудабокія… Толькі ёсць і другія дары, што кранаюць пачуцці глыбокія (Гіл.). 12. – Мне было б непрыемна, каб пра апошнюю (з) роду Яноўскіх сказалі, што яна забыла старадаўнюю гасціннасць (Каратк.).

**15. Прачытайце тэкст. Зрабіце марфалагічны разбор прыслоўяў па наступнай схеме: 1) лексіка-семантычны разрад; 2) ад якой часціны мовы прыслоўе ўтворана, спосаб утварэння; 3) ступень параўнання (для прыслоўяў, утвораных ад якасных прыметнікаў); 4) форма суб'ектыўнай ацэнкі; 5) сінтаксічная роля ў сказе.**

Увосень, пад поўдзень, як забярэ свае сілы сонца, -- ціхенька разгорнецца дзе над каляінай позні, сіратлівы малачайнік – дробная кветка на высокім сцябле. Падобна яна да цыбатай якой птушкі, што ў гэты час ляціць дзе-небудзь над полем у цёплы вырай ці так куды ў спакой восенных узлескаў. Цішыня тады стаіць скрозь. Пахне свежая ралля, пятрэе сухое бадыллё, цвёрды чабор хаваецца ў іржэўнік. З голаю галавою ходзіць восень па ціхіх сваіх сцежках. Яна садзіцца на берагах рэчак, гладзіць рукою траву. Рука ў яе

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

каструбаватая, у зямлі. Восень сядзіць і бродзіць доўга. Часамі мацней правядзе яна па самотнай чараціне над вадой, над пенчуком скошанага аеру. Сівая распушаная мяцёлка ўздрыгнецца, а навокал весялей зашэпча вецце і шум пойдзе сонечным полем скрозь далёка. Зашэпча хвойнік, жоўты дубняк, чырвоны асіннік.

К. Чорны.

**Заданні для самастойнай працы**

**1. Спішыце, раскрываючы дужкі. Растлумачце правапіс прыслоўяў і блізкіх да іх спалучэнняў слоў.**

**Варыянт 1**

(На) многа, (пасля) заўтра, (на) заўсёды, (з) цямна (да) цямна, (у) адно, (па) трое, (у) дзвюх, (на) двое, (з) маладу, (па) просту, (у) шчыльную, (у) адкрытую, (да) шчэнту, (у) покат, (на) вобмацак, (па) хлапечы, (да) часу, (на) памяць, (да) упаду, (на) ляту, (з) ходу, (у) абрэз, (усё) адно, (без) упынна, (у) плаў, (на) жаль, крыж (на) крыж, так (сама).

**Варыянт 2**

(На) славу, (з) разбегу, (без) упынку, (без) аглядна, (у) адзіночку, (усё) роўна, (як) след, (як) раз, (за) пазухай, (па) брацку, (што) вечар, (на) век, (з) нізу, (на) пракат, (у) брод, (з) нячэўку, (на) удалую, (у) пустую, (у) трох, (у) права, (па) двое, (да) заўтра, (да) ранку, (з) нізу (да) верху, (па) роўну, (на) трое, сам (на) сам, там (сама).

**2. Падбярыце да фразеалагізмаў адпаведныя прыслоўі-сінонімы і запішыце іх.**

**Варыянт 1**

На мой розум, ад веку да веку, ад душы, на вагу золата, за адным скрыпам, да ніткі, не сёння-заўтра, на разбор шапак, за свет, на ўзвей вецер, слова ў слова, да зарэзу, да макулінкі, без задніх ног, душа ў душу, вушы развесіць.

**Варыянт 2**

На ўсе застаўкі, уласнай персонай, у чорта на кулічках, як у аптэцы, з горам папалам, з адкрытай душой, закасаўшы рукавы, да ладу, да касцей, да гібелі, гады ў рады, верай-праўдай, аж пяткі блішчаць, на кароткую нагу, на чым свет стаіць, да дна.

**Безасабова-прэдыкатыўныя словы**

**Асноўныя паняцці:** безасабова-прэдыкатыўныя словы як асобны разрад нязменных слоў, граматычнае значэнне і семантычныя групы безасабова-прэдыкатыўных слоў.

**1. Спішыце прыказкі. Вызначце, да якіх часцін мовы належаць выдзеленыя словы. Абазначце іх сінтаксічную ролю ў сказе.**

1. Тое дарага, што **нялёгка** даецца. 2. Слухай **многа**, а гавары **мала**. 3. За разумнай галавой і рукам **лёгка**. 4. У добрага чалавека заўсёды **многа** добрых сяброў. 5. Не той **багата** ведае, хто многа гаворыць. 6. У яго з адной губы і **горача**, і **сцюдзёна**. 7. Сядзіць **ціха**, а думае ліха. 8. Усюды **добра**, а дома **лепей**. 9. Дзе гультаёў больш, там жывецца **горш**. 10. Не таго **шкада**, што з’еў, а таго, што застаецца. 11. Калі хочаш хлеб мець, то **трэба** зямліцу глядзець. 12. Дзе **коратка**, там і рвецца. 13. Новы венік **чыста** мяце.

**Што агульнае маюць прыслоўі і безасабова-прэдыкатыўныя словы і чым яны адрозніваюцца?**

**2. Вызначце лексіка-семантычныя групы безасабова-прэдыкатыўных слоў.**

1. Журботнае курлыканне крылатых вандроўнікаў нельга слухаць без хвалявання (Р.І.). 2. На пясчанай гарушцы за хатай казлякоў незлічона (Пташ.). 3. З бярозамі растуць вольха, асіна і маленькія дубкі. Ім тут сыра, і яны дробныя (Пташ.). 4. Лёгка пасварыцца,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

цяжэй памірыцца (Прык.). 5. Ці дзіва, што падзеі, якія хвалявалі Курані, намі бачацца багата ў чым інакш, што падзеі гэтыя маглі падавацца і куранёўцам зусім інакш, як нам (І.М.). 6. Добра адно, што коні, як бы разумеючы небяспеку, з горкі падбавілі бегу (І.М.). 7. Дзе шчырая праца, там густа, а дзе лянота – там пуста (Прык.). 8. Васільку было вельмі ніякавата ад той ласкі, і ён сарамліва ўхіляўся (В.Б.). 9. Глухая цемра запанавала ў старожцы, патухлі апошнія іскрынкі ў грубцы, стала халадней (В.Б.). 10. Па ўсім было відаць, што ласяня будзе жыць, што небяспека праходзіць, прападае (Дал.). 11. Чуваць было, як стогнуць за лесам Доўгія балоты. Там аселі журавы (Пташ.). 12. Кніг у вёсцы было малавата, а кніга нам замяняла ўсё: і тэатр, і кіно, і радыё, і тэлебачанне (Гіл.).

**3. Выпішыце безасабова-прэдыкатыўныя словы і вызначце, з якімі часцінамі мовы яны суадносяцца. Асобна запішыце словы, якія не маюць амонімаў сярод самастойных часцін мовы.**

1. Пры сонейку цёпла, пры матцы добра (Прык.). 2. Лянота: рабіць не хачу, а есці ахвота (Прык.). 3. Цікава: чым жа яна [масквічка] прысушыла яе мужа? (Атр.). 4. Было вільготна і адначасова душнавата, нягледзячы на тое, што рака абдымала свежасцю і прахалодай (Гаўр.). 5.Не дзіва: надвор'е стаяла сухое, спякотнае (У.Г.). 6. І да булавы трэба галавы (Прык.). 7. Зрабілася крыху лягчэй на сэрцы і весялей (Атр.). 8. Напалохаў мех, дык і торбы страшна (Прык.). 9.Дзе дружна, там і хлебна (Прык.). 10 Было холадна і голадна, і я чытаў гэты томік на печы пры малюсенькай, зробленай з пэтээраўскага патрона газнічцы (Гіл.). 11. І страшнавата ўжо бывае, і шкада, што ўбачана і зроблена так мала (Б.). 12. Не варта ўжо варушыць мінулае і спрабаваць вярнуць тое, чаго не вернеш, ніколі (Каратк.). 13. Сорам не ведаць сваёй мясцовасці (Як.). 14. Воблакі ўпрыгожваюць неба, апранаюць яго. Відаць, як воблачная града шлейфам-шалікам працягнецца ад небасхілу да небасхілу, то коўдрай зацягне ў адным баку…(Гр.).

**4. Складзіце па два сказы з кожным словам, каб у адным выпадку яно ўжывалася як прыслоўе, у другім – як безасабова-прэдыкатыўнае.**

Цёпла, хораша, дрэнна, позна, шмат.

**5. Знайдзіце ў сказах безасабова-прэдыкатыўныя словы і зрабіце іх разбор па наступнай схеме: 1) лексіка-семантычная група; 2) разрад паводле суадноснасці з іншымі часцінамі мовы (толькі безасабова-прэдыкатыўнае; суадноснае з прыслоўем, назоўнікам, прыметнікам).**

1. Хоць і шкада кветак, але касі луг, як цвіце (Прык.). 2. Утульнасці тут было небагата: дзьмула з вокнаў, дым не хацеў ісці ў комін і, расплываючыся пад нізкай столлю, выядаў людзям вочы…(В.Б.). 3. А цяпер вось і немца няма, і танкаў не чуваць, дык хочацца яшчэ і цяпла і сухога месца. Дзіўна…(В.Б.). 4. У жоўтым бярозавым лісці чырванеюць рабіны і спеюць каліны – іх у Бярэзаўцы шмат (Пташ.). 5. Цікава, чаму чалавек, калі кахае і асабліва, калі каханая побач, ператвараецца ўвесь у слых і зрок? (З.П.). 6. У хвойніку было яшчэ светла, але дужа сцюдзёна, і Азевіч зноў стаў хукаць сабе на грудзі, грэць рукі за пазухай (В.Б.) 7. Яму раніцою росна, у поўдзень млосна, а ўвечары камары кусаюць (Прык.). 8. Раней было светла ад яблык уверсе, дзе кроны дрэў, а цяпер быццам нехта перавярнуў яблыні – яблыкаў аж бела на зямлі, а кроны нязвыкла палохаюць халоднаю, нейкай трагічнаю чарнатою (Я.С.). 9. А пад вечар стала яшчэ цішэй (Дзел.). 10. Галоўнае – тут было суха, макрата і холад засталіся з таго боку дзвярэй і напаміналі аб сабе толькі невыразным шорхатам ветру (В.Б.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ